# СТАРАВЕРЫ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў ПАЧАТКУ 1920-Х ГГ.: АСАБЛІВАСЦІ РАССЯЛЕННЯ І КОЛЬКАСНЫ СКЛАД (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ПЕРАПІСАЎ 1919 Г. І 1921 Г.)

# OLD BELIEVERS OF WESTERN BELARUS IN EARLY 1920'S: PECULIARITIES OF THEIR SETTLEMENT AND QUANTITATIVE COMPOSITION (BASED ON THE MATERIALS OF THE 1919 AND 1921 CENSUSES)

Аўсейчык Уладзімір Яўгенавіч,
Наваполацк, Беларусь

Ключавыя словы: стараверы, Заходняя Беларусь, рассяленне, этнічная група, перапіс насельніцтва.

Рэзюмэ.У артыкуле на аснове матэрыялаў перапісаў 1919 г. і 1921 г. даецца характарыстыка староверскага насельніцтва Заходняй Беларусі ў пачатку 1920-х гг. Выяўлены асаблівасці іх рассялення, разгледжаны пытанні колькаснага складу.

Keywords: Old Believers, Western Belarus, settlement, ethnic group, census of population.

Summary. On the basis of 1919 and 1921 censuses materials the article describes characteristics of Old Believers' population of Western Belarus in the beginning of 1920s. The peculiarities of their settlement are revealed and the questions of quantitative structure are examined.

У айчыннай гуманітарыстыцы гісторыя і культура стараверскага насельніцтва на беларускіх землях ў першай палове XX ст. вывучаны дастаткова слаба. Да нашага часу не распрацаванымі застаюцца многія аспекты, сярод якіх і пытанні рассялення старавераў, іх колькаснага складу. У дадзеным артыкуле даецца дэмаграфічная характарыстыка стараверскага насельніцтва Заходняй Беларусі (асаблівасці рассялення, колькасны склад) на аснове матэрыялаў перапісаў 1919 г. і 1921 г.

Першыя даныя аб колькасці старавераў на беларускіх землях пасля Першай сусветнай вайны дае перапіс насельніцтва, які быў праведзены ў снежні 1919 г. на беларускіх, літоўскіх і украінскіх землях, занятых польскімі войскамі. Гэтыя тэрыторыі знаходзіліся пад кіраўніцтвам Грамадзянскага ўпраўлення Усходніх земляў (Zarząd Cywilny Ziem Wschodnich) (Малюнак 1). Беларускія землі былі ўключаны ў тры акругі: Віленскую (Віленскі, Троцкі, Ашмянскі, Свянцянскі, Лідскі, Гродзенскі, Навагрудскі, Браслаўскі, Дзісенскі паветы), Брэсцкую (Брэсцкі, Ваўкавыскі, Пружанскі, Слонімскі, Кобрынскі, Пінскі, Мазырскі паветы), Мінскую (Мінскі, Бабруйскі, Барысаўскі, Слуцкі і Ігуменскі паветы) [2, с. 64]. Некаторыя з даных перапісу 1919 г. былі апублікаваныя [3], але большасць захоўваецца ў архівах. Шэраг матэрыялаў перапісу захоўваецца ў Цэнтральнай статыстычнай бібліятэцы ў Варшаве (Centralna Biblioteka Statystyczna) [1].




Малюнак 1 – Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел тэрыторый, падначаленых Грамадзянскаму ўпраўленню Усходніх земляў (1919–1920 гг.)

Згодна з данымі перапісу 1919 г., у межах Віленскай, Брэсцкай і Мінскай акруг налічвалася 33 018 старавераў, што склала каля 0,85% ад усяго насельніцтва гэтых трох акруг (Табліца 1).

Табліца 1 – Размеркаванне старавераскага насельніцтва на тэрыторыі, якая знаходзіліся пад кіраўніцтвам Грамадзянскага ўпраўлення Усходніх земляў (1919 г.)

| Акруга | Колькасць, чал. | Доля ад усяго насельніцтва акругі, % |
|---|---|---|
| Віленская | 27 224[1] | 1,67 |
| Мінская | 5 768 | 0,53 |
| Брэсцкая | 26 | – |

Складзена аўтарам на аснове [1].

Як вынікае з даных перапісу, асноўная колькасць старавераў пражывала ў межах Віленскай і Мінскай акруг. У Брэсцкай акрузе старавеpы былі зафіксаваны толькі ў Мазырскім (19 чалавек), Баранавіцкім (3) і Брэсцкім (4) паветах [1]. Лідарам па колькасці старавераскага насельніцтва з’яўлялася Віленская акруга. У Табліцы 2 прадстаўлена размеркаванне старавераскага насельніцтва па яе паветах.

Табліца 2 – Размеркаванне старавераскага насельніцтва па паветах Віленскай акругі (1919 г.)

| Павет | Колькасць, чал. | Доля ад насельніцтва павета, % |
|---|---|---|
| Браслаўскі | 9 346 | 11,33 |

[1] Даныя, якія апублікаваў Я.Ромэр па выніках перапісу, некалькі адрозніваюцца. Ён налічыў у Віленскай акрузе 26 698 старавераў [3, s. 30].

| | | |
|---|---|---|
| Дзісенскі | 9 043 | 4,68 |
| Свянцянскі | 4 930 | 3,53 |
| Віленскі | 1 636 | 0,89 |
| Г. Вільня | 378 | 0,29 |
| Вілейскі | 894 | 0,42 |
| Лідзкі | 526 | 0,28 |
| Троцкі | 323 | 0,35 |
| Ашмянскі | 140 | 0,07 |
| Гродзенскі | 8 | - |
| Навагрудскі | - | - |

Складзена аўтарам на аснове [1].

Сярод паветаў Віленскай акругі найбольшая колькасць старавераў была зафіксавана ў Браслаўскім і Дзісенскім. На момант перапісу Браслаўскі павет складаўся з часткі былога Новааляксандраўскага (Ковенская губерня) і Ілукштанскага (Курляндская губерня). А таму значная яго частка не ўваходзіць у сучасную тэрыторыю Беларусі. Ужо ў ліпені 1920 г. землі былога Ілукштанскага павета былі перададзены ў склад Латвіі. Разам з тым і не ўсе землі былога Новааляксандраўскага павета з’яўляюцца ў сучасны перыяд беларускімі (тэрыторыямі гмін Дукшты, Смолвы, Рымшаны зараз у складзе Літвы). Уласна з усяго Браслаўскага павета да беларускіх земляў адносяцца гміны Браслаў, Відзы, Дрысвяты, Опса, Плюсы, Слабодка. Як вынікае з падлікаў, на сучасныя беларускія землі прыпадала каля 40% ад усёй колькасці старавераў Браслаўскага павета (не перавышала 4 тыс.чалавек). Найбольшая доля старавераў у агульным складзе насельніцтва налічвалася ў гмінах Плюсы, Слабодка і Дрысвяты. Па колькасці старавёрскага насельніцтва гэтыя гміны таксама лідзіравалі (бяруцца да ўвагі толькі сучасныя беларускія землі). Найменшая колькасць стараверaў пражывала ў гмінах Опса і Браслаў [3, s. 37].

Лідарам па колькасці стараверaў на беларускіх землях быў Дзісенскі павет. На яго тэрыторыі найбольшая колькасць стараверaў пражывала ў гміне Перабродддзе (каля 3 тыс. чалавек і 36,9% ад усяго насельніцтва). Істотная колькасць таксама налічвалася ў гмінах Ёды (каля 1,5 тыс. чалавек і 11,6% ад усяго насельніцтва), Новы Пагост (каля 1,3 тыс. чалавек і 15,4% ад усяго насельніцтва), Богін (каля 0,8 тыс. чалавек і 9,2% ад усяго насельніцтва), Друйск (каля 0,65 тыс. чалавек і 7,6% ад усяго насельніцтва), Германавічы (каля 0,45 тыс. чалавек і 5,8% ад усяго насельніцтва) [3, s. 38].

Істотная доля стараверaў пражывала ў Свянцянскім павеце. Але толькі ў гмінах Гадуцішкі (большая яе частка не адносіцца ў сучасны перыяд да беларускіх земляў), Камаі, Лынтупы і Свір доля стараверaў у агульнай структуры насельніцтва была істотнай (бярэцца да ўвагі толькі сучасныя беларускія землі). А ў Вілейскім павеце староверы пражывалі амаль выключна ў гмінах Лучай, Манькавічы, Хоценчыцы. Але іх колькасць не была вялікай [3, s. 38, s. 41; 8, №8].

Больш поўную і сістэмную інфармацыю аб колькасці і асаблівасцях рассялення стараверaў у Заходняй Беларусі на пачатку 1920-х гг. даюць матэрыялы перапісу 1921 г. Аднак частка Віленшчыны (у т.л. і беларускія тэрыторыі) не была ахоплена гэтым перапісам. Даныя аб старавёрскім насельніцтве ў паветах Віленскай зямлі, згодна з перапісам 1921 г., прадстаўлены ў Табліцы 3.

Табліца 3 – Размеркаванне староверскага насельніцтва па беларускіх паветах згодна з перапісам 1921 г.

| Павет | Колькасць старавераў, чал. | Доля старавераў у агульнай колькасці насельніцтва, % |
|---|---|---|
| *Віленская зямля* | | |
| Дзісенскі | 9 638 | 5,57 |
| Браслаўскі | 5 482 | 8,75 |
| Дунілавіцкі | 719 | 0,64 |
| Вілейскі | 178 | 0,14 |
| Свянцянскі | Перапіс не праводзіўся | |
| Ашмянскі | | |
| *Навагрудскае ваяводства* | | |
| Баранавіцкі | 67 | 0,06 |
| Лідскі | 21 | 0,01 |
| Валожынскі | 5 | – |
| Навагрудскі | 4 | – |
| Стаўбцоўскі | 2 | – |
| Нясвіжскі | 1 | – |
| Слонімскі | – | – |
| *Палескае ваяводства* | | |
| Лунінецкі | 16 | – |
| Брэсцкі | 2 | – |
| Пінскі | 1 | – |
| Драгічынскі | – | – |
| Кобрынскі | – | – |
| Касаўскі | – | – |
| Пружанскі | – | – |
| *Беластоцкае ваяводства* | | |
| Гродзенскі | 16 | – |
| Ваўкавыскі | – | – |

Складзена аўтарам на аснове: [6, s. 5; 5, s. X; 7, s. X; 4, s. X].

Як вынікае з прыведзеных даных, асноўная колькасць старавераў пражывала на тэрыторыі Віленскай зямлі. На астатніх беларускіх землях, якія ўваходзілі ў склад Польшчы ў пачатку 1920-х гг. старавераў пражывала вельмі мала. Так, на тэрыторыі Навагрудскага ваяводства налічвалася толькі 100 старавераў. Амаль усе яны пражывалі ў Баранавіцкім і Лідскім паветах. У Палескім ваяводстве колькасць старавераў была яшчэ меншая. На беларускіх землях ваяводства налічвалася толькі 19 чалавек. З іх 17 пражывала ў гарадах (15 у Лунінцы і 2 у Брэсце) [7, s. X]. У беларускіх паветах Беластоцкай губерні таксама старавераў амаль не налічвалася. Згодна з данымі перапісу 1921 г., толькі ў Гродзенскім павеце пражывала 16 чалавек. У Ваўкавыскім павеце староверы не былі зафіксаваныя.

На тэрыторыі Віленскай зямлі лідарам па колькасці староверскага насельніцтва быў Дзісенскі павет. У агульнай структуры насельніцтва павета староверы складалі каля 5,57% (Табліца 3). Лідарам па колькасці старавераў у павеце была гміна Пераброддзе. Згодна з данымі перапісу 1921 г. на яе тэрыторыі пражывала 3 122 старавераў, што складала 38,18% ад усяго насельніцтва гміны. Староверы пражывалі больш чым у палове яе населеных пунктаў. Істотная колькасць старавераў налічвалася таксама ў паўночнай і заходняй частках

Дзісенскага павета (гміны Ёды, Новы Пагост, Богін, Друя, Германавічы, Чэрасы, Шаркаўшчына). Ва ўсходніх і паўднёвых землях павета старавераў пражывала мала. На гэтай тэрыторыі параўнальна невялікая колькасць стараверах зафіксавана ў гмінах Залессе, Глыбокае і Пліса. Зусім невялікая колькасць стараверах пражывала ў гмінах Лужкі, Мікалаёва, Стэфанполь, Мёры [6, s. 39–76].

Наступным па колькасці стараверах быў Браслаўскі павет. Тут у 1921 г. пражывала звыш 5 тысяч чалавек, што складала каля 8,75% ад усяго насельніцтва павету. Па колькасці старавераў у павеце саступалі толькі каталікам. Як сведчаць даныя перапісу, стараверы пражывалі ва ўсіх гмінах Браслаўскага павета. На беларускай тэрыторыі павета лідарамі па колькасці старавераў былі гміны Плюсы, Відзы, Слабодка і Дрысвяты. Па долі старавераў у агульнай структуры насельніцтва Браслаўскага павета гэтыя гміны таксама займалі лідыруючыя пазіцыі. Асабліва вылучалася гміна Плюсы. У агульным складзе яе насельніцтва стараверы, згодна з перапісам 1921 г., складалі 20,92%. У Відзкай, Дрысвяцкай і Слабодскай гмінах доля старaверскага насельніцтва была значна ніжэйшай [6, s. 3–20]. У гмінах, тэрыторыя якіх не адносіцца да сучаснай Беларусі, стараверах пражывала ня шмат, Так, у гміне Дукшты налічвалася 339 стараверах, у гміне Рымшаны – 103, у гміне Смолвы – 382 [6, s.7–14].

Дунілавіцкі і Вілейскі паветы не адносіліся да ліку густазаселеных старaверскім насельніцтвам. На 1921 г. доля старaверскага насельніцтва ў агульнай структуры насельніцтва паветаў была зусім нізкай (0,64% – у Дунілавіцкім, 0,14% – у Вілейскім). Яны па колькасці саступалі каталікам, праваслаўным і іўдзеям. У Дунілавіцкім павеце стараверы пражывалі толькі ў гміне Лучай, Манькавічы, Мядзель і Паставы. У астатніх гмінах іх або ўвогуле не налічвалася, або іх колькасць была зусім невялікай. У Вілейскім павеце стараверы зафіксаваны ў гмінах Хоценчыцы, Ілля, Маладзечна, Алковічы. Але іх колькасць тут была зусім нязначнай [6, s. 78–94].

Такім чынам, аналіз матэрыялаў перапісаў насельніцтва 1919 і 1921 гг. паказвае, што ў гэты час на тэрыторыі Заходняй Беларусі пражывала значная колькасць старaверскага насельніцтва. Амаль усё яно было засяроджана ў паўночнай частцы рэгіёна (Браслаўскі, Дзісненскі, Свянцянскі паветы). Як вынікае з даных перапісаў, дадзены рэгіён з'яўляўся адным з лідараў па колькасці старавераў на Беларусі ў гэты перыяд.

Літаратура

1. Grafik składu wyznaniowego narodowości i składu narodowościowego wyznań. Wilno: Komisariat Generalny ZCZW [Zarządu Cywilnego Ziem Wschodnich], Centralne Biuro Spisu Ludności [rękopis]. – 1920. – 28 tabl. Электронны рэсурс. – Рэжым доступу: http://statlibr.stat.gov.pl/F?func=full-set-set&set_number=000008&set_entry=000001&format=999

2. Łazowska, B. Spis ludności na ziemiach wschodnich Rzeczypospolitej Polskiej w 1919 r. // Wiadomości Statystyczne. – 2019. – № 10. – S. 63–76.

3. Romer, E. Spis ludności na terenach administrowanych przez Zarząd Cywilny Ziem Wschodnich (grudzień 1919). – Lwów-Warszawa: Książnica Polska Towarzystwa Nauczycieli Szkół Wyższych, 1920. – 50 s.

4. Skorowidz miejscowości Rzeczypospolitej Polskiej opracowany na podstawie wyników Pierwszego Powszechnego Spisu Ludności z dn. 30 września 1921 r. i innych

źródeł urzędowych. – Warszawa: nakladem glownego urzedu statystycznego, 1924. – T. 5: Województwo Białostockie. – VII, 150 s.

5. Skorowidz miejscowości Rzeczypospolitej Polskiej opracowany na podstawie wyników Pierwszego Powszechnego Spisu Ludności z dn. 30 września 1921 r. i innych źródeł urzędowych. – Warszawa: nakladem glownego urzedu statystycznego, 1923. – T. 7, cz. 1: Województwo Nowogrodzkie. – X, 125 s.

6. Skorowidz miejscowości Rzeczypospolitej Polskiej opracowany na podstawie wyników Pierwszego Powszechnego Spisu Ludności z dn. 30 września 1921 r. i innych źródeł urzędowych. – Warszawa: nakladem glownego urzedu statystycznego, 1923. – T. 7, cz. 2: Ziemia wileńska (powiaty: Brasław, Duniłowicze, Dzisna i Wilejka). – VI, 119 s.

7. Skorowidz miejscowości Rzeczypospolitej Polskiej opracowany na podstawie wyników Pierwszego Powszechnego Spisu Ludności z dn. 30 września 1921 r. i innych źródeł urzędowych. – Warszawa: nakladem glownego urzedu statystycznego, 1924. – T. 8: Województwo Poleskie. – X, 84 s.

8. Wilno i Ziemia Wileńska: 12 map ilustrujących stosunki wyznaniowe, narodowościowe, szkolne i t. p. Województwa Wileńskiego / [red. Zygmunt Hartung, et al.]. – Wilno: Lux, 1931. – 6+12 kart.